*3.* Основы теории и методики духового музыкально-исполнительского искусства / В. Н. Апатский ; Нац. музык. акад. Украины им. П. И. Чайковского. – Киев, 2006. – 432 с.

*4. Скороходов, В. П.* Мастер-класс профессора Скороходова : учеб. издание / В. П. Скороходов. – Минск : БГАМ, 2014. – 216 с.

***А. І. Смолік,***
*доктар культуралогіі, прафесар,*
*загадчык кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

## КУЛЬТУРОЛАГ НА РЫНКУ ПРАЦЫ: ЗДАБЫТКІ І ПРАБЛЕМЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Назву майго даклада падказаў твор Ван Гога «Башмакі», які выклікаў у свой час шмат дыскусій наконт сэнсу і сімвалаў, закладзеных мастаком у гэтым палатне. Дастаткова сказаць, што геніяльны нямецкі філосаф М. Хайдэгер значную частку свайго артыкула «Паходжанне і сэнс мастацтва» прысвяціў інтэрпрэтацыі дадзенага твора [5]. З супрацьлеглай трактоўкай сапраўднага сэнсу карціны выступілі Поль Гоген, амерыканскі марксіст Меер Шапіра і інш. Адным словам, як і «Чорны квадрат» К. Малевіча, карціна выклікала і выклікае да гэтага часу шмат меркаванняў. Дык што ж хацеў сказаць вобразам старых, стаптаных чаравікаў мастак? Што ён убачыў у іх агрубелай ад часу скуры і колеры?

Шэраг крытыкаў у галіне выяўленчага мастацтва лічаць, што ў вобразе чаравікаў увасоблены стан заходнеўрапейскай культуры, якая, на думку Ван Гога, існавала ў канцы XIX ст. як бы ва ўмовах завершанасці, як постсучаснасць, што сведчыла аб фактычным згасанні еўрапейскага культурнага канона. Са «смерцю аўтара» і «эратычным целам культурнага тэксту», абвешчаным Р. Бартам [1], адбылася страта еўрапейскай культурай высокіх духоўных ідэалаў і пачаўся этап сістэмнага крызісу каштоўнасцей і арыенціраў. Еўрапейскае грамадства і яго культура, паводле ўяўленняў мастака, нагадвалі чаравікі, якія некалі былі недасягальнай марай яго ўладальніка, упрыгожаннем і гонарам. У іх ён пераадолеў бясконцыя шляхі-

дарогі, мноства перашкод, стварыў безліч духоўных і матэрыяльных даброт. Але з цягам часу чаравікі знасіліся, набылі непрывабны выгляд, у іх матэрыяле назапасілася шмат бруду дарогі, яны пранізаны безнараканай трывогай за лёс чалавецтва. Аб крызысе еўрапейскай культуры ў свой час гаварылі М. А. Бердзяеў [2], О. Шпенглер [6] і іншыя прадстаўнікі культурфіласофскай думкі.

Заняпад заходнееўрапейскай культуры, які распачаўся у канцы XIX ст., набыў востры характар у XX ст. і вельмі яскрава праявіўся ў парадыгме постмадэрна. К. Уілбер у сваёй знакамітай працы «Вока духа: Інтэгральнае бачанне для зрэшты звіхнутага свету», на наш погляд, метка заўважыў сутнасць тагачаснай еўрапейскай культуры. Па яго меркаванні, постмадэрн стаў новым светапоглядам і апошнім прыстанішчам для заходняга грамадства, страціўшага канчаткова хрысціянскія ідэалы і каштоўнасці. У мастацтве нарцысізм і нігілізм змагаліся за галоўную сцэну, якой, па сутнасці навогул ужо не было; кіч і халтура сутыкаліся ў барацьбе за прадстаўніцтва, якое ўжо нічога не значыць; квітнеў толькі дружны эгаізм мастакоў і крытыкаў, якія згубіліся ў люстэркавых лабірынтах і захапляліся толькі сваім адлюстраваннем у свеце, якому яно некалі было неабыякавым [4].

Фасадам сучаснай еўрапейскай, у тым ліку і беларускай культуры становіцца масавая культура як нейкі «інтэлектуальны фастфуд», які не патрабуе напружання духоўных сіл для ўспрымання. Характэрныя яе асаблівасці – прымітывізацыя чалавечых адносін (звядзенне іх сутнасці да канфлікту «добрых» і «дрэнных» людзей, культ моцнай асобы (Тэрмінатар, Джэймс Бонд і інш.), грошай, поспеху, асабістага абагачэння, жорсткасці, насілля, сексу, штучнай забаўляльнасці, натуралізму, бодзіцэнтрызму. Побач з прамысловай індустрыяй хуткімі тэмпамі развіваецца індустрыя забаўляльнага вольнага часу, якая ўключая масавыя пастановачныя відовішчы ад спартыўнацыркавых да эратычных і іншыя шоу, фарміруецца новы тып культуры *street culture* (вулічная культура).

На глебе згасання нацыянальных культур еўрапейскіх краін як на дражджах расце глабальная культура, пад якой часцей за ўсё разумеюць сусветную культуру як суму нацыянальных культур, якія ўваходзяць у яе. Але гэта, на наш погляд, памыл-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ковае разуменне сутнасці і зместу глабальнай культуры. Глабалізацыя культуры – гэта, перш за ўсё, вестэрнізацыя (панаванне заходняй культуры над усімі народамі), нават хутчэй, амерыканізацыя культуры, эканомікі і каштоўнасцей народаў свету; замахі на духоўныя і нацыянальныя ідэалы, традыцыі і этнічныя меншасці шляхам распаўсюджання сваіх каштоўнасцей і ідэалогіі. Так, ідэолагі глабалізму сцвярджаюць, што амерыканскі капітал павінен пераканаць усіх людзей, якія знаходзяцца пад яго ўплывам, што амерыканскі шлях (амерыканскія музыка, фільмы, літаратура, інфармацыя, ідэалогія і інш.) уяўляе сабой тое, што яны жадаюць, і ў гэтым працэсе амерыканская гегемонія апраўдана і задавальняе інтарэсы ўсіх людзей. Важнейшай асаблівасцю ўплыву заходняй культуры на нацыянальныя культуры з'яўляецца навязванне ім далёкіх ад духоўнасці каштоўнасцей, ідэалаў і ідэй. Даследаванне глабальных працэсаў у сферы культуры сведчыць: глабалізацыя ўжо разбурыла асновы шматлікіх культурных інфраструктур у шэрагу краін свету. Асабліва шмат страчвае ад наступстваў культурнага глабалізму традыцыйная культура.

Разуменне негатыўных наступстваў глабальнай культуры вымусіла сусветную супольнасць прыняць калектыўныя меры па захаванні культурнай спадчыны, створанай чалавецтвам. Маецца на ўвазе прынятае ў 2003 г. ЮНЕСКА Міжнароднай канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У дадзеным прававым акце адзначаецца, што «працэсы глабалізацыі і сацыяльных пераўтварэнняў, ствараючы ўмовы для дыялогу паміж супольнасцямі, разам з тым з'яўляюцца, як і праявы нецярпімасці, прычынамі сур'ёзнай пагрозы дэградацыі, знікнення і разбурэння, якія навіслі над нематэрыяльнай культурнай спадчынай» [3, арт. 2].

У такой супярэчлівай сацыякультурнай сітуацыі на постсавецкай прасторы, у тым ліку і ў Рэспубліцы Беларусь, у 1990-х гг. зараджаецца інтэграваная навука аб культуры – культуралогія. У адукацыйныя стандарты і навучальныя планы ўсіх ВНУ ўключаюцца новыя сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны, у тым ліку і культуралогія, у шэрагу ўніверсітэтаў (БДУ, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітет імя Я. Купалы, БДПУ імя М. Танка і інш.) распачынаецца падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасці «тэорыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і гісторыя культуры», ствараюцца факультэты культуралогіі і адпаведныя кафедры. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы адкрываюцца саветы па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры, дзе на мяжы XX–XXI стст. адбыліся першыя абароны кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Такім чынам, на рынку працы з'явіўся новы спецыяліст. Як адрэагаваў рынак на новы інтэлектуальны «прадукт»? Скажу адразу – станоўча! Дактарам культуралогіі кіраўніцтва пэўных вышэйшых навучальных устаноў прапанавала ўзначаліць кафедры культуралогіі і іншых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (У. Ф. Мартынаў, У. П. Скараходаў, А. А. Павільч), кандыдаты навук уліліся ў шэрагі дацэнтаў і нават прафесараў беларускіх ВНУ. Запыт на маладых вучоных быў і застаецца ў розных установах сацыякультурнай сферы. Так, намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь па навуковай і выдавецкай дзейнасці з'яўляецца кандыдат культуралогіі А. А. Суша, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік шмат гадоў узначальвае кандыдат культуралогіі Т. А. Джумантаева, начальнікам аддзела навучальных устаноў Міністэрства культуры з'яўляецца кандыдат культуралогіі А. А. Кавленя, на пасадзе прарэктара па міжнародных сувязях РІВШ працуе кандыдат культуралогіі Л. С. Кажухоўская. Кандыдаты культуралогіі І. Л. Коган, С. К. Кананові́ч, І. М. Шумская займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю ў ЗША і Канадзе. Адным словам, на сённяшні дзень рынак не запоўнены спецыялістамі вышэйшай кваліфікацыі ў галіне культуралогіі, ён нават пашыраецца. Літаральна два гады назад востры дэфіцыт на культуролагаў быў у Камітэце судовых экспертыз. Шэраг магістраў, аспірантаў і нават кандыдатаў культуралогіі знайшлі сабе там месца працы. Расце цікавасць да беларускай культурагагічнай школы, якая адзначыла сваё дваццацігоддзе, у КНР. У бягучым акадэмічным годзе на кафедры культуралогіі навучаецца 6 кітайскіх аспірантаў і 21 магістрант, прычым 19 з іх на англійскай мове навучання. У 2018 і 2019 гг. дзве аспіранткі КНР паспяхова абаранілі дысертацыі і займаюць пасады дацэнта і прафесара ў кітайскіх ВНУ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз працаўладкавання выпускнікоў бакалаўрыята і магістратуры па спецыяльнасці «прыкладная культуралогія» таксама сведчыць аб попыце на менеджэраў сацыякультурнай дзейнасці і міжкультурнай камунікацыі з боку ўстаноў культуры і адукацыі. В 2018 г. першыя працоўныя месцы атрымалі 418 бакалаўраў-культуролагаў, якія былі накіраваны ва ўстановы культуры ўсіх рэгіёнаў краіны. Большасць установ задаволена якасцю прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у БДУКМ (97,5 %).

Такім чынам, аналіз навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці выпускнікоў дактарантуры, аспірантуры, актыўнай сацыякультурнай работы выпускнікоў бакалаўрыята і магістратуры ва ўстановах культуры паказвае, што здабыткі ў культуралагічнай школы ёсць. Яны магчыма былі б больш пленнымі, калі б удалося пераадолець шэраг перашкод на шляху яе развіцця.


1. *Барт, Р.* Избранные работы: семиотика: поэтика / Р. Барт. – М. : Прогресс, 1989. – 616 с.

2. *Бердяев, Н. А.* Кризис искусства (Репринтное издание) / Н. А. Бердяев. – М. : СП Интерпринт, 1990. – 48 с.

3. Международная Конвенция об охране нематериального культурного наследия: принята 17 октября 2003 г. 32-й сессией Генеральной конференции ООН по вопросам образования, науки и культуры (ЮНЕСКО) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://unesdoc.unesco.org/images/ 0013/001325/132540r.pdf. – Дата доступа: 18.12.2018.

4. *Уилбер, К.* Око духа: Интегральное видение для слегка свихнувшегося мира / К. Уилбер. – М. : АСТ [и др.], 2002. – 476 с.

5. *Хайдеггер, М.* Исток художественного творения / М. Хайдеггер ; пер. с нем. А. В. Михайлова. – М. : Академический проект, 2008. – 528 с.

6. *Шпенглер, О.* Закат Европы. Очерки морфологии мировой истории : пер. с нем. / О. Шпенглер. – М. : Искусство, 1993. – 303 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ